*УДК 373. 3*

# ДА ПЫТАННЯ АБ ФАРМІРАВАННІ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

**З. М. Тамашэвіч**

*УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»,*
*вул. Э. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, Tamashevich_ne@tut.by*

У артыкуле разглядаецца паняцце камунікатыўнай кампетэнцыі і некаторыя метадычныя прыёмы яе фарміравання ў будучых настаўнікаў пачатковых класаў.

***Ключавыя словы:*** віды маўленчай дзейнасці; камунікатыўная кампетэнцыя; складнікі камунікатыўнай кампетэнцыі; маўленча-камунікатыўныя практыкаванні.

# ON THE QUESTION OF FORMATION OF COMMUNICATIVE COMPETENCE OF FUTURE PRIMARY SCHOOL TEACHERS

**Z. M. Tamashevich**

*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*E. Ozheshko St. 22, 230023, Grodno, Belarus, Tamashevich_ne@tut.by*

The article deals with the definition of communicative competence and some methods of formation of this skill for future primary school teachers

***Key words:*** communicative competence; components of communicative competence; speech-communicative exercises.

Апошнія два дзесяцігоддзі ідзе працэс мадэрнізацыі ў сістэме агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У цэнтры адукацыйнай парадыгмы па новай канцэпцыі становіцца фарміраванне моўнай асобы, якая валодае роднай мовай у розных сферах і сітуацыях камунікацыі. Галоўнае, каб настаўнік, а затым і вучань зразумеў, што мова вывучаецца не для таго, каб ведаць моўныя адзінкі, іх будову, значэнне, а для таго, каб з дапамогаю іх удзельнічаць у зносінах. Тут маецца на ўвазе інтэлектуальнае і творчае развіццё вучня, а таксама фарміраванне базавых якасцей асобы: камунікатыўнай актыўнасці, крытычнага мыслення, самастойнасці, ініцыятыўнасці. Для фарміравання і развіцця названых якасцей у вучняў пачатковых класаў павінны быць належным чынам падрыхтаваны настаўнікі. Да настаўнікаў пачатковых класаў прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: высокая якасць прафесійнай падрыхтоўкі, здольнасць да самаразвіцця, самаадукацыі, да выкарыстання інавацыйных тэхналогій у адукацыі.

Змены ў мэтах і змесце моўнай адукацыі патрабуюць новых

падыходаў па фарміраванні камунікатыўных кампетэнцый у будучых настаўнікаў, а затым і ў школьнікаў. «Камунікатыўная кампетэнцыя, на думку С. В. Мартынкевіч, – гэта сістэма моўных, маўленчых і маўленча-камунікатыўных ведаў і ўменняў, якая забяспечвае свабоднае маўленне» [1, с. 9]. Рыхтуючы студэнтаў да будучай прафесіі настаўніка, выкладчык паказвае, як фарміраваць камунікатыўныя ўменні і навыкі ў вучняў пачатковых класаў. А ці ведаем мы аб камунікатыўных навыках сваіх студэнтаў? На лекцыях па методыцы выкладання беларускай мовы ў асноўным студэнт канспектуе лекцыю або з'яўляецца пасіўным слухачом і гледачом (бо ён яшчэ засвойвае нейкую інфармацыю з камп'ютарных прэзентацый). На практычных занятках студэнты лёгка могуць паказаць свае веды па тэарэтычных пытаннях па пройдзенай тэме, таму што гэты матэрыял ёсць у лекцыйных сшытках студэнтаў, у вучэбных дапаможніках па дысцыпліне. Іншая справа, калі студэнту неабходна прааналізаваць канкрэтную старонку школьнага падручніка, ці адзін параграф, ці правіла з падручніка, ці практыкаванні для замацавання і г. д. Студэнты тады бездапаможныя, бо яны не могуць знайсці гатовы адказ ні ў вучэбным дапаможніку, ні ў камп'ютары, а самі падумаць, паглядзець на гэту з'яву з розных бакоў, прааналізаваць яе, зрабіць высновы, не хочуць, а нават некаторыя з іх і не могуць. Вось чаму на практычных занятках павінен адбывацца не «маналог выкладчыка», а камунікатыўны дыялог паміж студэнтамі і выкладчыкам, студэнтам і студэнтам(і).

Асновай камунікатыўнага навучання, згодна з праграмай па беларускай мове для 1–4 класаў агульнаадукацыйных навучальных устаноў з'яўляецца «авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў» [2, с. 2]. Як гэтыя патрабаванні рэалізаваць на практыцы? На нашу думку, неабходна больш звяртаць увагу на віды маўленчай дзейнасці: аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне, пісьмо. Ці могуць студэнты з пачутага ці прачытанага тэксту зрабіць высновы; ці могуць правільна інтанацыйна прачытаць тэкст і зразумець яго тэму і ідэю; ці валодаюць яны нормамі літаратурнага маўлення; тыпамі маўлення, розніцай паміж тэкстам-апавяданнем, тэкстам-апісаннем і тэкстам-разважаннем і інш.? Калі ж гэтымі ўменнямі валодаюць студэнты, то галоўнае – вучыць ствараць уласныя вусныя і пісьмовыя тэксты рознай накіраванасці. Нельга не пагадзіцца з М. Г. Яленскім, што адзін з асноўных прынцыпаў па развіцці маўлення – прынцып тэкставага навучання, бо вучэбны тэкст з'яўляецца «сродкам фарміравання моўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый, развіцця маўленча-камунікаўных

здольнасцей...» [3, с. 112]. І гэта невыпадкова, таму што адна з функцый тэксту – камунікатыўная, г. зн. з дапамогай тэксту мы не толькі будзем працаваць над моўнымі адзінкамі (гук, літара, склад, слова, сказ, тэкст), але і звернем увагу на тэму і ідэю тэксту, на загаловак, як пабудаваны тэкст, як звязаны часткі паміж сабой, як аўтар тэксту адносіцца да апісаных падзей (ці герояў) і інш. На лепшых узорах мастацкіх тэкстаў і студэнты, і вучні вучацца калектыўна і самастойна ствараць: вусныя і пісьмовыя ўласныя тэксты па аналогіі з прачытаным (ці пачутым) тэкстам; будаваць тэксты па дадзеным плане; дапаўняць тэкст апісаннем нейкай з'явы, прадмета ці чалавека; выказваць свае адносіны да герояў; вуснае ці пісьмовае супастаўленне герояў аднаго тэксту ці двух тэкстаў; падбор загалоўка(ў) да тэксту ў адпаведнасці з тэмай ці ідэяй; пабудова тэксту па дадзенай тэматычнай падборцы слоў і словазлучэнняў; пабудова выказванняў па апорных словах і алгарытмах; падрыхтоўка тэкстаў па дадзеным пачатку (і канцы); па серыі малюнкаў ці сюжэтным малюнку і г. д. Усе пералічныя віды работы з тэкстам адносяцца да маўленчых і маўленча-камунікатыўных практыкаванняў.

Для фарміравання і развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі студэнтаў неабходна больш увагі звяртаць на граматна пабудаванае маналагічнае і дыялагічнае маўленне. Маналагічнае маўленне – гэта выказванне па тэме з «улікам наступных характарыстык:

1) бесперапыннасць (выказванне не абмяжоўваецца адной фразай, а ўяўляе сабой звышфразавае адзінства пэўнага аб'ёму);

2) паслядоўнасць выкладу, лагічнась маўлення;

3) адносная сэнсавая завершанасць;

4) камунікатыўная накіраванасць выказвання;

5) тэматычнасць;

6) сінтаксічная ўскладненасць» [4, с. 165].

Тут магчыма выступленне студэнта(аў) на канкрэтнае тэарэтычнае пытанне па тэме практычных заняткаў; удзел у дыспуце ці выніковай канферэнцыі па педпрактыцы; выступленне студэнта(аў) з падрыхтаваным рэфератам і абмеркаванне выступлення ўсімі студэнтамі; прагляд відэаўрокаў па навучанні грамаце, беларускай мове ці літаратурным чытанні на лабараторных занятках і абмеркаванне іх па дадзеным плане або без яго па этапах урока. Вельмі важна, каб выкладчык звярнуў увагу студэнтаў, што не галоўнае пералік заданняў і практыкаванняў на ўроку, а важна, для чаго настаўнік іх выкарыстоўваў на ўроку, ці дапамаглі яны ў вырашэнні ці рэалізацыі адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых задач і інш. Можна падказаць студэнтам, каб яны падумалі, як будуць пачынаць сваё паведамленне (выступленне),

спыніцца на самых важных момантах урока, а затым зрабіць падагульненне.

Знаёмячы студэнтаў з дыялогам як відам вуснай камунікацыі, мэтай і задачамі дыялогу, відамі работы над гатовымі дыялогамі, можна прапанаваць работу ў парах падрыхтаваць дыялогі ў форме інтэрв'ю, дзе адзін студэнт будзе інтэрв'юіраваць, а другі будзе адказваць на пытанні, хоць разам распрацоўваюць і пытанні, і адказы: студэнт і абітурыент; студэнт і дэкан факультэта (рэктар); студэнт і бібліятэкар; студэнт і работніца сталовай; студэнт і сакратар дэканата і інш. Тут студэнты павінны свядома і мэтанакіравана выбраць моўныя сродкі ў адпаведнасці з сітуацыяй і сферай маўлення. Абавязковай лічыцца рэфлексія ці аналіз пасля правядзення такой работы па наступных крытэрыях:

а) уменне карыстацца формуламі этыкету;

б) уменне фармуліраваць цікавыя і змястоўныя пытанні;

в) уменне папрасіць удакладніць сказанае;

г) завяршэнне дыялогу з аналізам маўленчых паводзін інтэрв'юера і таго, хто адказвае на пытанні.

Працуючы над фарміраваннем камунікатыўнай кампетэнцыі ў студэнтаў, і вучняў, нельга абысці інтэрактыўныя метады, «як узмоцненую мэтанакіраваную дзейнасць педагога і вучняў па арганізацыі ўзаемадзеяння паміж сабой у мэтах развіцця» [5, с. 37]. Гэтыя метады распрацаваны для заняткаў па педагогіцы, але крэатыўныя настаўнікі-прадметнікі іх адапціравалі для правядзення сваіх урокаў. Пра некаторыя метады мы ўжо расказвалі ў сваіх публікацыях. Сёння нас цікавяць толькі тыя, якія дапамагаюць выкладчыку і настаўніку фарміраваць камунікатыўную кампетэнцыю студэнтаў і вучняў. Так, напрыклад, метады «Камплімент», «Падары кветку», «Закончы фразу», «Каб я быў з'явай прыроды» і інш. добра «ўпісваюцца» для развіцця камунікатыўных уменняў і навыкаў студэнтаў і вучняў. Сутнасць метаду «Камплімент» у тым, каб стварыць спрыяльную атмасферу ў калектыве і ўстанавіць паміж удзельнікамі камунікацыю. Кожны ўдзельнік па чарзе робіць суседу камплімент. Звычайна настаўнік гаворыць камплімент першым (а можа і вучань). Напрыклад, настаўнік гаворыць: «Анатоль, я рада, што ў цябе цудоўны настрой! Захавай яго на працягу ўсяго урока». Анатоль гаворыць суседцы справа: «Дзіяна, я ўпэўнены, што ты сёння за ўрок атрымаеш выдатную адзнаку. Поспехаў табе!» і г. д.

Сутнасць метаду «Каб я быў з'явай прыроды» ў тым, што настаўнік на ўроку прапануе вучням ідэнтыфікаваць сябе з якой-небудзь прыроднай з'явай. Праз 2–3 хвіліны вучні тлумачаць, чаму яны выбралі гэтую з'яву,

што ў адметнае ў ёй ад іншых з'яў, чаму яны атаясамліваюць сябе з гэтай з'явай. Як варыянты названага метаду могуць быць: «Каб я быў дрэвам…»; «Каб я быў кветкай…»; «Каб я быў зубрам (ільвом)…». У такім выглядзе выкарыстоўваецца гэты метад для развіцця звязнага маўлення вучняў, развіцця фантазіі, творчага ўяўлення, папаўнення іх слоўнікавага запасу. А можна яго выкарыстаць на абагульняючым уроку па часцінах мовы. Напрыклад, «Каб я быў назоўнікам (прыметнікам, дзеясловам)» вучань павінен успомніць асаблівасці гэтай часціны мовы, асноўныя яе катэгорыі, прывесці цікавыя прыклады, паказаць, чым гэтая часціна мовы адрозніваецца ад іншых, а што аднолькавае з іншымі часцінамі і г. д.

Апошнім часам для развіцця камунікатыўных кампетэнцый выкарыстоўваюць квест-тэхналогіі (kvest – анг. 'пошукі') – гульня, якая патрабуе ад удзельнікаў рашэння разумовых задач для прасоўвання па сюжэце. Задача гэтай тэхналогіі – хутка здабываць інфармацыю з розных крыніц і выкарыстоўваць яе ў сваёй дзейнасці. Найбольш запатрабаваныя прыёмы гэтай тэхналогіі: ролевая гульня, работа ў малых групах, інтэрв'ю і інш. Галоўнае ў квест-тэхналогіі – гэта павышэнне матывацыі да навучання, выхаванне культуры суразмоўніцтва, уменне працаваць у групе (камандзе), паўтарэнне і абагульненне атрыманых ведаў, уменне ацэньваць узровень сваіх ведаў, уменняў і навыкаў. Лічыцца, што квест-тэхналогія можа выкарыстоўвацца для вырашэння адукацыйных задач, калі неабходна абагульніць веды студэнтаў ці вучняў па пройдзеных тэмах. Гэтая ж тэхналогія можа вырашаць развіваючыя задачы, калі неабходна фарміраваць навыкі пошуку і адбору патрэбнай інфармацыі па новай тэме ў інтэрнеце. Настаўнік на ўроку прадстаўляе спіс сайтаў, з якіх вучні будуць знаходзіць інфармацыю для выканання сваіх заданняў. Вось тут кожная група можа паказаць сваё ўменне хутка знайсці новую інфармацыю, прачытаць, апрацаваць (супаставіўшы са знаёмымі ведамі), узяць толькі тую, што патрэбна. Такая работа актывізуе ўдзел вучняў у адукацыйным працэсе, стымулюе самастойную дзейнасць, а значыць развівае інтэлектуальныя здольнасці. Квест-тэхналогія – гэта адна з форм дыстанцыйнага навучання.

Такім чынам, камунікатыўная кампетэнцыя дазваляе студэнту/вучню:

1) арыентавацца ў маўленчай сітуацыі для рэгулявання сваіх маўленчых паводзін (каму, што, якім чынам я буду гаварыць);

2) усвядомлена вырашаць камунікатыўныя задачы (умець паведаміць ці папрасіць, прапанаваць ці заклікаць да чаго-небудзь, пагадзіцца ці не пагадзіцца з кім-небудзь, з чым-небудзь і г. д.);

3) выбраць адпаведны камунікатыўным задачам моўны матэрыял

(словы, словазлучэнні, сказы);

4) выбраць тып маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне);

5) умела выкарыстоўваць формы маўленчага этыкету.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Мартынкевіч С. В.* Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў 5–6 класаў пры навучанні беларускай мове : аўтарэф. дыс. …канд. пед. навук: 13.00.02 / БДУ. Мінск, 2012.

2. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання: 1–4 класы. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. С. 45.

3. *Яленскі М. Г.* Лінгваметадычныя парадыгма асобасна арыентаванага навучання беларускай мове ў пачатковых класах агульнаадукацыйнай школы : дыс. …докт. пед. навук : 13.00.02. – Мінск, 2003.

4. *Ляшчынская В. А., Шведава З. У.* Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапаможнік. Мінск : РІВШ, 2007.

5. *Кашлев С. С.* Интерактивные методы абучения педагогике: учеб. пособие. – Минск : Вышэйшая школа, 2004.